# АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ ПАЛІТЫКА-ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ СЯРОД ЖАНЧЫН У ПАРТЫЗАНСКІХ ФАРМІРАВАННЯХ НА АКУПАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1941–1944 гг.)

*І.У. Нікалаева*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Адной з характэрных асаблівасцей партызанскага руху на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. стаў масавы ўдзел у ім жанчын. Статыстычныя даныя БШПР, распрацаваныя на 282,5 тыс. партызан, сведчаць аб удзеле ў партызанскім руху (з улікам агентурных разведчыкаў, сувязных, загінуўшых, трапіўшых у палон і прапаўшых без вестак) 45 242 жанчын ці 16% ад усіх партызан. Далучэнне да партызанскага руху значнай колькасці жанчын паставіла падпольныя партыйныя, камсамольскія органы, партызанскае кіраўніцтва перад неабходнасцю ўлічваць не толькі асаблівасці ваеннай падрыхтоўкі жанчын-партызанак, але і спецыфіку выхаваўчай работы сярод іх.

За пасляваенны перыяд у вывучэнні вопыту ідэалагічнай і палітычнай работы сярод асабовага складу партызанскіх фарміраванняў праведзена значная работа, аднак такі аспект тэмы, як дыферэнцыраваны падыход у масава-палітычнай рабоце сярод насельніцтва і партызан у тыле ворага, да гэтага часу мала вывучаны і не абагулены. Мэтай дадзенай работы з'яўляецца аналіз арганізацыі і вынікаў палітыка-выхаваўчай работы сярод жанчын-партызанак.

**Матэрыял і метады.** Аснову дадзенага даследавання склалі архіўныя матэрыялы – дакладныя запіскі, паведамленні і справаздачы ўпаўнаважаных ЦК, падпольных абкамаў і райкамаў КП(б)Б і ЛКСМБ аб масава-палітычнай рабоце сярод жаночага насельніцтва ў тыле ворага,– якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь у фондах партыйных і камсамольскіх камітэтаў, а таксама БШПР.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Кіраўніцтва выхаваўча-палітычнай і ідэалагічнай работай у партызанскіх фарміраваннях на часова акупаванай тэрыторыі Беларусі знаходзілася пад кантролем КП(б)Б як кіруючай партыі, і, як і да вайны, было жорстка цэнтралізаваным. Як сведчыць аналіз архіўных і апублікаваных крыніц, у сувязі са значным прытокам жанчын, асабліва маладога ўзросту, у рады беларускіх партызан вышэйшымі партыйнымі і камсамольскімі органамі, надавалася асобная ўвага рабоце сярод іх. Так, на бюро ЦК ЛКСМБ 10 кастрычніка 1942 г. было разгледжана пытанне "Аб рабоце камсамольскіх арганізацый Беларусі сярод жаночай моладзі ў тыле праціўніка" [1, арк. 89–90].

Сакратары нелегальных партцэнтраў былі строга падсправаздачныя ў сваіх дзеяннях цэнтральным органам партыі за лініяй фронту. Падпольныя партыйныя і камсамольскія камітэты павінны былі планаваць сваю работу сярод насельніцтва і партызан вобласці, састаўной часткай адпаведных планаў звычайна з'яўляўся раздзел "Работа сярод жанчын", дзе вызначаліся канкрэтныя мерапрыемствы і тэрмін іх правядзення. Штомесячна планаваць палітыка-масавую работу сярод жаночай часткі асабовага складу атрадаў і брыгад павінны былі камісары партызанскіх фарміраванняў, іх намеснікі па камсамольскай рабоце. У якасці прыкладу можна прывесці план камсамольскай работы атрада "Бальшавік" партызанскай брыгады "Беларусь" Мінскай вобласці на май 1944 г.:" 9.05.1944 г. Правесці заняткі сярод жанчын па вывучэнні матэрыяльнай часткі вінтоўкі. 25.05.1944 г. Правесці гутарку сярод жанчын на тэму: "Самаадданая барацьба жанчын у тыле ворага" [2, арк. 446].



Рэпазіторый ВДУ

З мэтай павышэння эфектыўнасці выхаваўчай работы сярод жанчын і аказання ім паўсядзённай дапамогі ў рабоце і быце ў партызанскіх фарміраваннях ствараліся жаночыя арганізацыі [3, арк. 79]. Шырокае распаўсюджанне з 1943 г. атрымалі нарады жанчын-партызанак у брыгадах і пасяджэнні жаночага актыву асобных атрадаў, на якіх абмяркоўваліся надзённыя пытанні.

Значнае месца ў выхаваўчай рабоце сярод жанчын займала вусная і друкаваная прапаганда. Пры гэтым шырока практыкавалася размножванне тэзісаў лекцый і дакладаў, пра іх тэматыку можна меркаваць з адпаведных назваў: “Аб ролі жанчын у партызанскіх атрадах”, “Жанчына ў Айчыннай вайне” [4, спр. 7, арк. 241; спр. 8, арк. 122]

Пэўная работа па падборы і засылцы ў тыл ворага неабходнай літаратуры праводзілася кіруючымі камсамольскімі і партыйнымі органамі. У прыватнасці, бюро ЦК ЛКСМБ ад 22 лістапада 1943 г. было зацверджана выданне брашуры “Девушки Белоруссии в Великой Отечественной войне” тыражом у 20 тысяч экземпляраў [1, арк. 299].

Партыйнымі і камсамольскім камітэтамі, камандаваннем партызанскіх фарміраванняў з мэтай палітычна-выхаваўчай і ідэалагічнай работы сярод жанчын выкарыстоўвалася свята 8 Сакавіка. Адпаведныя мерапрыемствы па яго падрыхтоўцы і правядзенні вызначаліся пастановамі і распараджэннямі партыйных камітэтаў. Характэрнай у гэтым плане з’яўляецца пастанова Іўеўскага РК КП(б)Б ад 2 сакавіка 1944 г.:

“1. Міжнародны дзень 8 Сакавіка правесці як шырокую масавую палітычную кампанію максімальнай мабілізацыі і прыцягнення жанчын і дзяўчат у атрадах і сярод мірнага насельніцтва на актыўную барацьбу для хутчэйшага і канчатковага разгрому германскага фашызму.

2. Прапанаваць сакратарам пярвічных партарганізацый, камісарам атрадаў і РК ЛКСМБ ва ўсіх партызанскіх атрадах правесці падрыхтоўчую работу з жанчынамі-партызанкамі, адзначыўшы іх ролю ў баявой і палітычнай рабоце ў тыле ворага. Напярэдадні 8 сакавіка правесці ўрачысты сход жанчын з дакладам аб Міжнародным жаночым дні 8 Сакавіка...” [4, спр. 17, арк. 160].

Адной з найбольш дзейсных форм масава-палітычнай работы, якая спрыяла актывізацыі вучобы і баявой дзейнасці сярод жаночай часткі асабовага складу партызанскіх фарміраванняў, адыгрывалі калектыўныя абавязацельствы, якія бралі на сябе партызанкі ў межах перадсвяточных спаборніцтваў. Так, жанчыны партызанскай брыгады “Уперад”, якая дзейнічала на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці, на сумесным паседжанні 8 сакавіка 1944 г. прынялі рашэнне ўключыцца ў першамайскае спаборніцтва з партызанкамі брыгады імя В.І. Чапаева. Згодна з ім, яны абавязваліся авалодаць ваеннымі спецыяльнасцямі, актыўна ўдзельнічаць ў баявых дзеяннях, забяспечыць асабовы склад брыгады ў любых умовах дабраякасным харчаваннем, утрымліваць харчаблок ва ўзорным стане, прымаць самы актыўны ўдзел у грамадскім жыцці [5, с. 190].

Пэўную ролю ва ўмацаванні дысцыпліны і адказнасці партызанак адыгрывалі меры заахвочвання, якія шырока практыкаваліся ва ўсіх фарміраваннях. Лепшым партызанкам за добрасумленнае выкананне сваіх абавязкаў аб’яўлялася падзяка ў спецыяльных загадах, а таксама пры падвядзенні вынікаў баявых аперацый. Усяго да пачатку 1944 г. ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза было ўзнагароджана 10 308 партызан Беларусі. Сярод узнагароджаных звыш 600 жанчын [6, с. 220].

**Заключэнне.** Такім чынам, у сувязі са значным прытокам у партызанскі рух жанчын партыйнымі і камсамольскімі органамі, партызанскім кіраўніцтвам былі

Рэпазіторый ВГУ

ўлічаны і асаблівасці выхаваўчай работы сярод іх, што вызначыла не толькі дыферэнцыраваны падыход у масава-палітычнай рабоце, але і пошук спецыфічных арганізацыйных форм і метадаў уздзеяння, сярод якіх – нарады і пасяджэнні жаночага актыву партызанскіх фарміраванняў, а таксама стварэнне жаночых арганізацый у атрадах і брыгадах .

Спіс літаратуры

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 63-п, воп. 6, спр. 2.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Ф. 4-п, Воп. 33-а, Спр. 71.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Ф. 3500, Воп. 4, Спр. 301-а.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Ф. 63-п, Воп. 16.
5. Памяць : Іўеўскі раён: Гіст.-дакум. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі / Гал. рэд. Г.К. Кісялёў. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – 510 с.
6. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : В 3 т. / Гл. редкол. А.Т. Кузьмин (пред.) и др. – Минск : Беларусь, 1983–1985.– Т. 2 : 1943. – 1984. – 551 с.

## НЭП У ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ

*М.М. Пархімовіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

У 1990-я гады ў беларускай гістарыяграфіі актыўна распрацоўваліся праблемы аграрнай палітыкі Савецкай улады ў 1920-х гадах. Аўтары работ даследавалі станаўленне і развіццё кааперацыі, працэсы стварэння і існаванне калектыўных гаспадарак, новую эканамічную палітыку і іншыя аспекты аграрнай палітыкі ў беларускай вёсцы. Найбольш грунтоўнымі даследаваннямі гэтага часу, на наш погляд, сталі працы А. Сарокіна і М. Бяспалай [1].

У 1999 годзе Бяспалая М.А. абараніла доктарскую дысертацыю ў якой даследавала нэп у беларускай вёсцы. Пасля гэтага цікаўнасць беларускіх гісторыкаў да аграрнай гісторыі 1920-х гадоў згасла. Па гэтай праблеме не было абаронена ніводнай кандыдацкай і доктарскіх дысертацый. У друку не з’явілася прац, якія можна было б параўнаць з даследаваннямі 1990-х гадоў. Магчыма, гісторыкі палічылі, што з абаронай доктарскай дысертацыі Бяспалай М.А. усе аспекты аграрнай палітыкі 1920-х гадоў вырашаны.

Не абвяргаючы грунтоўнасці работы Марыі Аркадзеўны Бяспалай, мы лічым, што аграрная гісторыя 1920-х гадоў патрабуе далейшых распрацовак. У прыватнасці, па-за ўвагай даследчыкаў засталіся праблемы нэпа на рэгіянальным, губернскім узроўні.

Мэта працы: прасачыць станаўленне новай эканамічнай палітыкі на вёсцы ў Віцебскай губерні.

**Матэрыял і метады.** Работа грунтуецца на дакументах Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці. У прыватнасці, намі распрацаваны 25 спраў 56 фонда (Віцебскі губернскі выканаўчы камітэт), а таксама 15 спраў, што тычыліся дзейнасці павятовых выканаўчых камітэтаў. Пры выкананні работы выкарыстаны агульнагістарычныя метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Згодна рашэнню ЦК РКП(б) Віцебская губерня была вылучана са складу ССРБ ў студзені 1919 года і далучана да РСФСР. У 1921 годзе, калі была ўведзена нэп, яна заставалася складовай часткай Савецкай Расіі.

Рэпазіторый ВДУ